Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 25. Варыянт 3**

**Заданні склала:** Курашова Наталля Аляксандраўна, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства, ДУА "Гімназія №10 г.Гомеля"

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**

1. Як аўтар дакумента характарызуе славян?
2. Якія племянныя аб'яднанні ўсходніх славян сфарміраваліся на тэрыторыі Беларусі?
3. На аснове якіх племянных княжанняў былі ўтвораны дзяржавы-княства? Назавіце імёны князёў - кіраўнікоў гэтых княстваў.
4. Дакажыце, што дзяржавы-княствы Беларусі знаходзіліся ў складзе Кіеўскай Русі? Як складаліся палітычныя адносіны паміж кіеўскімі князямі і князямі Полацкай зямлі?

**Крыніца I**

**Са «Стратэгікона» Маўрыкія**– аб норавах і звычаях славян, VI ст.

*(візантыйскі ваенны трактат, які лічыцца адным з самых значных помнікаў візантыйскай ваеннай навукі)*

Плямёны славян і антаў па сваім ладзе жыцця, па сваіх норавах, па сваёй любові да свабоды; іх ніякім чынам нельга схіліць да рабства ці падпарадкавання ў сваёй краіне. Яны шматлікія, цягавітыя, лёгка пераносяць жар, холад, галізну, недахоп у ежы. Да прыбываючых да іх іншаземцаў яны ставяцца ласкава <…>. Якія знаходзяцца ў іх у палоне яны не трымаюць у рабстве, як іншыя плямёны, на працягу неабмежаванага часу, але, абмяжоўваючы [тэрмін рабства] пэўным часам, прапануюць ім на выбар: ці жадаюць яны за вядомы выкуп вярнуцца дадому або застацца там, [дзе яны знаходзяцца], на становішчы свабодных і сяброў?

У іх вялікая колькасць разнастайнай жывёлы і пладоў зямных, якія ляжаць у кучах, асабліва проса і пшаніцы. Яны селяцца ў лясах, ля нязручнапраходных рэк, балот, азёр. Змагацца са сваімі ворагамі яны любяць у месцах, якія зараслі густым лесам, у цяснінах, на абрывах; з выгадай для сябе карыстаюцца [засадамі], раптоўнымі атакамі, хітрасцямі, і днём, і ноччу, вынаходзячы шмат [разнастайных] спосабаў. Дасведчаны яны таксама і ў пераправе праз рэкі, пераўзыходзячы ў гэтых адносінах усіх людзей. <…>

**Крыніца 2**

**Картасхема «Беларускія землі ў XI ст.»**

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі




**Крыніца 3**
**З "Аповесці мінулых гадоў", XII ст.**

<…>Гэтак жа і гэтыя славяне прыйшлі і селі па Дняпры і назваліся паляне<…>; а іншыя селі паміж Прыпяццю і Дзвіною і назваліся дрыгавічы; іншыя селі на Дзвіне і назваліся палачане, па рэчцы, якая ўпадае ў Дзвіну, названай Палата, ад яе і назваліся палачане. <…>…радымічы ж і вяцічы – ад роду ляхаў. Былі ж два браты ў ляхаў – Радзім, а другі – Вятко; прыйшлі і селі: Радзім на Сожы, і ад яго празваліся радзімічы. Усе гэтыя плямёны мелі свае звычаі, і законы сваіх бацькоў, і паданні, і кожныя - свой нораў.

У год 6488 (980) <…> паслаў (Уладзімір) да Рагвалода ў Полацак сказаць: «Хачу дачку тваю ўзяць сабе за жонку». Той жа спытаў у дачкі сваёй: "Ці хочаш за Уладзіміра?". Яна адказала: «Не хачу разуць сына рабыні, але хачу за Яраполка». Гэты Рагвалод прыйшоў з-за мора і трымаў уладу сваю ў Полацку, а Туры ў Тураве, па ім і называліся тураўцы. <…> І напаў Уладзімір на Полацак, і забіў Рагвалода і двух яго сыноў, а дачку ўзяў за жонку.

Калі прайшоў год, у 6496 (988) <…> …Уладзімір жа быў прысвечаны сам (у хрысціянства), і сыны яго, і зямля яго. Было ж у яго 12 сыноў <…> І пасадзіў Вышаслава ў Ноўгарадзе, Ізяслава ў Полацку, а Сетаполка ў Тураве…

У год 6529 (1021). Прыйшоў Брачыслаў, сын Ізяслава, унук Уладзіміра на Ноўгарад, і ўзяў Ноўгарад. І, захапіўшы наўгародцаў і маёмасць іх, пайшоў да Полацку зноў. І калі прыйшоў ён да ракі Судамір, і Яраслаў з Кіева на сёмы дзень нагнаў яго тут. І перамог Яраслаў Брачыслава, і наўгародцаў вярнуў у Ноўгарад, а Брачыслаў бег да Полацка.

У год 6575 (1067) Падняў рацьу Полацку Усяслаў, сын Брачыслава, і заняў Ноўгарад. Трое ж Яраславічаў, Ізяслаў, Святаслаў, Усевалад, сабраўшы воінаў, пайшлі на Усяслава ў моцны мароз. І падышлі да Мінска, і мінчане зачыніліся ў горадзе. Браты

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі
ж гэтыя ўзялі Мінск і перабілі ўсіх мужоў, а жонак і дзяцей захапілі ў палон і пайшлі да Нямігі, і Усяслаў пайшоў супраць іх.

**Адказы:**

1.Славяне апісваюцца аўтарам дакумента як свабодалюбівы, цягавіты, працавіты, гасцінны народ. Яны добрыя да рабоў-палонных.

2. Крывічы-палачане, дрыгавічы, радзімічы.

3.Крывічы-палачане заснавалі Полацкае княства, дрыгавічы - Тураўскае княства.
Рагвалод, Ізяслаў, Брачыслаў, Усяслаў, Тур, Святаполк.

4. Тураўскае княства знаходзілася ў складзе Кіеўскай зямлі, пад непасрэдным кіраваннем кіеўскага князя або яго пасадніка. Тураўскі пасад перадаваўся старэйшаму спадчынніку. Полацкае княства кіравалася спадкаемцамі Уладзіміра Святаславіча.
Палітычныя адносіны полацкіх і кіеўскіх князёў былі складанымі. Полацк імкнуўся да незалежнасці, пашырэння сваіх тэрыторый і ўплыву. Кіеўскія князі вайсковым шляхам абмяжоўвалі палітычныя імкненні Полацка да незалежнасці. Напрыклад, Уладзімір Святаславіч захапіў Полацк, ажаніўся на Рагнедзе. Іх сын Ізяслаў стаў князем у Полацку - дынастыя Ізяславічаў - гэта полацкая галіна Рурыкавічаў. Неаднаразова полацкія князі хадзілі з ваеннымі паходамі на Ноўгарад, імкнучыся падпарадкаваць яго свайму ўплыву. Але князі Кіева заўсёды жорстка каралі іх за гэтыя спробы. Разам з Кіеўскай Руссю беларускія землі прынялі хрысціянства.